# Інжынер будучыні

**Пад такой назвай прасторы тэхнічнага профілю адкрываюцца ў шасці ўніверсітэтах краіны для падрыхтоўкі будучых інжынераў.**



Па выніках конкурсу маладзёжных ініцыятыў 2024 года экспертнай камісіяй была падтрымана ініцыятыва савета маладых вучоных пры Міністэрстве адукацыі Беларусі па стварэнні прастор па інтарэсах тэхнічнага профілю "Інжынер будучыні". У рамках праекта школьнікі змогуць вучыцца ў кваліфікаваных выкладчыкаў і атрымліваць практычныя парады ад прафесіяналаў.

Інжынерныя прасторы сёння адкрыты на базе пяці ўніверсітэтаў: ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай, ВДТУ, БрДТУ, ГДТУ імя П.В.Сухога і БРУ. А 28 лютага ўрачыстае адкрыццё яшчэ адной прасторы адбудзецца і ў ГрДУ імя Янкі Купалы.

— Сёння мы прыкладаем шмат намаганняў, каб павысіць цікавасць да інжынерных і тэхнічных спецыяльнасцей, таму што за імі будучыня. Менавіта такія спецыялісты змогуць забяспечваць тэхналагічны суверэнітэт краіны. Спадзяюся, нашы новыя прасторы дапамогуць старшакласнікам знайсці сябе, рэалізаваць свой патэнцыял і паспрыяюць павышэнню іх тэхналагічнай культуры, — сказала старшыня савета маладых вучоных пры Міністэрстве адукацыі Настасся Кісялевіч.

У сваю чаргу рэктар ПДУ Юрый Раманоўскі падкрэсліў, што адкрыццё новай прасторы — знакавая падзея для ўніверсітэта:

— Сёння ёсць тры прафесіі, без якіх немагчыма будучыня, — педагог, урач і інжынер. Але менавіта інжынеры адказныя за паспяховае развіццё краіны. Таму яны павінны быць ініцыятыўнымі, крэатыўнымі, рашучымі — спецыялістамі з высокімі прафесійнымі кампетэнцыямі, якія мы ім і дапаможам развіць.

Начальнік аддзела па адукацыі Наваполацкага гарвыканкама Пётр Апановіч выказаў упэўненасць, што новая прастора дасць старшакласнікам выдатную магчымасць глыбей пагрузіцца ў прафесію інжынера і ў будучыні зрабіць правільны і ўсвядомлены выбар спецыяльнасці.

— Наш аддзел адукацыі і ПДУ звязваюць цесныя партнёрскія і сяброўскія адносіны. Мы ўзаемадзейнічаем па розных напрамках, але асаблівае значэнне надаём фарміраванню ў дзяцей пазітыўнага стаўлення да інжынернай дзейнасці. Гэтаму спрыяюць нашы чатыры інжынерныя класы, а зараз будзе дапамагаць яшчэ і новая прастора. Думаю, нашы дзеці па заслугах ацэняць яе, — дадаў Пётр Адамавіч.

На шасці інжынерных прасторах будуць займацца вучні 9—11 класаў. У час навучання яны змогуць развіць тэхналагічныя кампетэнцыі і мысленне, займаючыся праектнай дзейнасцю і выкарыстоўваючы спецыяльныя тэхнічныя ўстройствы, абсталяванне і тэхналогіі.

Работа інжынернай прасторы будзе накіравана на актывізацыю інавацыйнага мыслення моладзі, прыцягненне старшакласнікаў і студэнтаў да ўдзелу ў навукова-тэхнічных распрацоўках і вырашэнне задач сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны.

> *Спадзяюся, нашы новыя прасторы дапамогуць старшакласнікам знайсці сябе, рэалізаваць свой патэнцыял і паспрыяюць павышэнню іх тэхналагічнай культуры.*
>
> **Настасся КІСЯЛЕВІЧ.**

— Упэўнена, што такія прасторы дапамогуць сфарміраваць у школьнікаў устойлівую цікавасць да інжынернай дзейнасці і паспрыяюць падрыхтоўцы больш кваліфікаваных кадраў, а таксама павысяць якасць навучання спецыялістаў тэхнічнага профілю, — рэзюмавала Настасся Кісялевіч.

**Вольга АНТОНЕНКАВА.**

**Фота прадастаўлена ПДУ.**